3. Концепция развития лесного комплекса Республики Беларусь до 2015 года. – Мн., 1999. – 116 с.

4. Лесной кодекс Республики Беларусь. – Мн., 2000. – 73 с.

5. Янушко А.Д., Санкович М.М., Желиба Б.Н. Хозрасчет и эколого-экономическая оценка земельных и лесных ресурсов в лесхозах Беларуси. – Мн., 1993. – 150 с.

6. Янушко А.Д. Лесное хозяйство Беларуси (история, экономика, проблемы и перспективы развития). – Мн., 2001. – 248 с.

УДК 630*6

А.В. Зубкевіч, аспірант

# АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ ЛЕСАНАРЫХТОЎЧАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ НА БЕЛАРУСІ

In this article the periods of forest utilization development process are marked out in time, peculiarities of logging organization form changes in Belarus are considered.

Беларусь здаўна была лясным краем, і лес у жыцці нашага народа ўвесь час займаў важнае месца: са старажытных часоў ён даваў ежу, працу, матэрыял для пабудовы жылля, гаспадарчых і абаронных збудаванняў. Дзякуючы здольнасці лясоў задавальняць разнастайныя патрэбы людзей, яны спрадвеку былі ўцягнуты ў сферу вытворчасці і сталі ў далейшым аб'ектам лесаводства. Разам з лесаводствам з'явілася і лясная гаспадарка як асаблівая галіна эканомікі. Для яе ўзнікнення нараўне з натуральнымі ўмовамі спатрэбіліся і грамадскія фактары, пэўны ўзровень развіцця прадукцыйных сіл і вытворчых адносінаў. Да іх адносяцца:

а)узнікненне і развіццё ўласнасці на зямлю, лес і іншыя прыродныя рэсурсы;

б)пераўтварэнне прадуктаў лесу і найперш драўніны ў тавар, які мае шырокае грамадскае значэнне;

в)пераўтварэнне лесу са сродку існавання чалавека ў сродак вытворчасці і самастойную сферу прыкладання працы.

Такім чынам, лясная гаспадарка ў тым выглядзе, у якім яе ведае сучасная культура, з'явілася ў сферы эканамічнага жыцця толькі тады, калі прадукты лесу набылі ўласцівасці тавару, а сам лес стаў аб'ектам прыкладання працы, калі на яго ўсталявалася тая альбо іншая форма ўласнасці [1].

Адначасова з развіццём лесакарыстання ішло развіццё лесанарыхтоўчай вытворчасці, спачатку як састаўной часткі лясной гаспадаркі. Формы арганізацыі лесанарыхтоўчай вытворчасці ў сваім гістарычным развіцці не былі статычнымі, а заўжды знаходзіліся ў працэсе пастаянных змен.

Разглядаючы гістарычны працэс развіцця лясной гаспадаркі ад першых момантаў яе ўзнікнення да цяперашняга часу, можна адзначыць перамяшчэнне цэнтра цяжару ад пабочнага карыстання лесам да прамога, ці галоўнага, карыстання лесам. Так, пры першабытнаабшчынным ладзе, які меў вельмі нізкі ўзровень развіцця прадукцыйных сіл, лясной гаспадаркі яшчэ не было. Лес для людзей быў сродкам існавання, крыніцай ежы, месцам пражывання. Ва ўяўленнях народаў таго перыяду лес быў бясконцым, што выключала ўсялякую неабходнасць рэгулявання лесакарыстання. Кожная абшчына ці род асвойвалі невялічкія кавалкі лесу каля паселішчаў для палявання, збірання грыбоў, ягад, бортніцтва. Па меркаваннях В.І. Перахода і А.Д. Янушка гэта быў перыяд

**нерэгулюемага лесакарыстання** [1, 2]. Будучы прадметам карыстання, драўніна гэтага перыяду не валодала менавой вартасцю, так як яна не здольна была абменьвацца на іншыя гаспадарчыя даброты, а валодала толькі спажывецкай вартасцю, заснаванай на карыснасці прадмета. Такім чынам, на дадзеным этапе развіцця грамадства лесакарыстанне не мела вызначанай арганізацыйнай формы, а насіла характар хаатычнага і нерэгулюемага карыстання драўніннай і недраўніннай прадукцыяй лесу.

У другой палове IX ст. пачаўся працэс фарміравання беларускай дзяржаўнасці. Адбываўся распад першабытнаабшчыннага ладу і стваралася саслоўна-класавае грамадства. Аснову магутнасці феадалаў, князёў і баяр складалі іх зямельныя і лясныя ўладанні. З'явіліся першыя заканадаўчыя акты, што рэгулявалі права ўласнасці і карыстання зямельнымі ўгоддзямі. Лес набыў больш шырокае грамадскае значэнне. Ён стаў крыніцай атрымання не толькі пабочных прадуктаў лесу, але і драўніны, з якой будаваліся дамы, лодкі, выраблялiся розныя прадметы не толькі для асабістага карыстання, але і для абмену, што прывяло да абмежавання і забароны асобных відаў карыстання лесам. Так, на Русі ўжо ў IX ст. было забаронена паляванне ў княжацкіх лясах, а з XII ст. пачала брацца плата за выпас жывёлы, паляванне, бортніцтва. Такое становішча тлумачыцца тым, што ва ўсе часы прававое рэгуляванне ажыццяўлялася толькі ў адносінах да тых рэсурсаў, якія з'яўляліся дэфіцытнымі [3]. З развіццём грамадства, павелічэннем колькасці насельніцтва і з памяншэннем плошчы лясоў забароны і абмежаванні павялічваліся. Пры гэтым усё больш узрастала вага драўнінакарыстання, сутнасць якой была ў "прыгатаванні такіх прадуктаў, лёгкая перавозка якіх ужо дае нейкі даход ад лесу, калі груваская драўніна яшчэ бясцэнна; да іх адносяць: здабычу паташу, смалы, дзёгцю, вуглевыпальванне...". Усё гэта – другасныя прадукты ляснай вытворчасці, і гэты перыяд развіцця лесакарыстання мы можам назваць **перыядам карыстання другаснымі прадуктамі драўніны** [2].

У агульным ходзе эвалюцыі ляснай гаспадаркі гэты пачатак эксплуатацыі драўніннай масы мае вялікае значэнне. Ён азначае паварот да прамога карыстання лесам, калі па меры знішчэння лясоў "ствараецца пераход да другога парадку рэчаў – да лесу гаспадарчага". Гэты перыяд адбываецца толькі тады, калі з павелічэннем лесакарыстання і з развіццём прамысловасці з'яўляецца пагроза знішчэння лясоў у будучыні [2]. На Беларусі гэты перыяд развіцця лесакарыстання прыпадае на феадальна-прыгонны лад, калі лес са сродку існавання чалавека пераўтварыўся ў сродак вытворчасці, а лясная гаспадарка пачала вызначацца як галіна грамадскай вытворчасці са сваімі мэтамі і задачамі. Мясцовыя феадалы выкарыстоўвалі такую форму арганізацыі вытворчасці, як фальварак – комплекс жылых і гаспадарчых пабудоў каля ўладанняў пана, пры якіх вяліся лесанарыхтоўкі, лесапіленне, перапрацоўка драўніны на вугаль, паташ, смалу і г.д. Такім чынам, эканамічнай асновай развіцця ляснай гаспадаркі на дадзеным этапе была феадальная ўласнасць на лес, а асноўнай формай арганізацыі лесакарыстання – фальваркавая гаспадарка з прымяненнем працы прыгонных сялян.

Пасля інкарпарацыі беларускіх земляў у склад Расійскай імперыі (1772–1795) развіццё прамысловасці Беларусі паскорылася і пачаўся працэс распаду феадальна-прыгонных адносінаў. Хуткі рост гарадоў, развіццё прамысловасці, сельскай гаспадаркі, гандлю патрабавалі вялікай колькасці драўніны. Нарыхтоўка лесу і дастаўка лясных матэрыялаў на рынак зрабілася вельмі выгаднай справай для лесапрамыслоўцаў і лесаўладальнікаў. Лесанарыхтоўкі з прымітыўнага промыслу, якія быў доўгі час своеасаблівым дадаткам сельскай гаспадаркі, афарміліся ў капіталістычную

лесанарыхтоўчую прамысловасць. Развіццё лясной гаспадаркі Беларусі праходзіла па прускаму шляху развіцця, калі пачынаў развівацца капіталізм у асобе капіталіста-лесапрамыслоўца з усталяванай феадальнай уласнасцю на лясы і лясныя землі. Гэтая ўласнасць ахоўвалася дзяржавай у форме манапольнай прыватнай уласнасці на зямлю. Лесапрамыслоўцу ў такіх абставінах адводзілася роля арэндатара лясных рэсурсаў, за што ён павінен быў аддаваць лесаўладальніку частку даходу ў выглядзе рэнты. Пры гэтым лесапрамысловец звычайна не прытрымліваўся лесаводчых патрабаванняў пры высечцы лесу. Галоўнай яго турботай была нарыхтоўка і дастаўка драўніны на рынак пры найменшых выдатках.

У 1802–1811 гг. у Расіі была ўведзена грашовая форма аплаты за лес на корані. Продаж драўніны ў выглядзе спелага лесу на корані стаў асноўнай крыніцай лясных даходаў лесаўладальнікаў. Такім чынам, паступова з узрастаючым попытам на драўніну і са з'яўленнем сродкаў і спосабаў нарыхтоўкі драўніны і яе транспарціроўкі ў вялікіх памерах, наступае трэці перыяд развіцця лесакарыстання – **перыяд прамога карыстання лесам**, г. зн. непасрэдна драўнінай, якая мае збыт і набыла ўласцівасці тавару. Гэты перыяд характэрны для развіцця лясной гаспадаркі і лесакарыстання на Беларусі з пачатку станаўлення капіталістычных адносінаў і да цяперашняга часу. Для зручнасці яго мэтазгодна раздзяліць на некалькі этапаў, розных па эканамічнаму зместу і арганізацыйным формам: 1) сярэдзіна XIX ст. – 1917 г.; 2) 1917–1920 гг. – час замежнай акупацыі і грамадзянскай вайны; 3) 1921–1927 гг. – этап правядзення новай эканамічнай палітыкі; 4) 1928–1941 гг. – гады першых пяцігодак і станаўлення таталітарнага рэжыму; 5) 1941–1945 гг. – гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага аднаўлення (1946–1950 гг.); 6) 50–60-я гг. – гады рэформ і сучасны перыяд (70-я і 80-я гг.) [1].

Форма лясной гаспадаркі Беларусі да 1917 г. складалася пад уздзеяннем продажу за мяжу буйнапамерных сартыментаў. У яе аснове была выбарачная гаспадарка ў хваёвых лясах з абаротам высечкі 150–180 гадоў. Пад уплывам нямецкага і расійскага капіталу ў пачатку ХХ-га ст. пачалі стварацца акцыянерныя таварыствы ў лесанарыхтоўчай, лесапільна-дрэваапрацоўчай, запалкавай, цэлюлозна-папяровай прамысловасці. У 1913 г. на Беларусі ўжо было 158 дрэваапрацоўчых, 10 запалкавых, 14 кардонна-папяровых прадпрыемстваў, стварыліся саюзы мясцовых лесапрамыслоўцаў. На гэты момант да 87 % лясоў знаходзілася ў прыватнай уласнасці і лясная гаспадарка была высокапрыбытковай. Так, па звестках А.Д. Янушкі, рэнтабельнасць вядзення лясной гаспадаркі на Беларусі была прыкладна на ўзроўні 416 % [1].

Асноўнай арганізацыйнай адзінкай у дзяржаўных і буйных прыватных лясах было лясніцтва, галоўнай мэтай якога была арганізацыя лесаўпарадкавання і лесакарыстання ў гэтых лясах. Нарыхтоўка драўніны праводзілася ў асноўным буйнымі лесапрамыслоўцамі, якія набывалі для высечцы вялікія масівы лесу.

Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. унесла істотныя змены ў эканоміку і арганізацыю лясной гаспадаркі Беларусі. Асновы новай эканамічнай палітыкі лесакарыстання вызначыў Дэкрэт аб лесах (27 мая 1918 г.), які адмяніў прыватную ўласнасць на зямлю і лясы. Лясная гаспадарка павінна была весціся ў "агульных інтарэсах і на падставе планамернага лесаўзнаўлення".

Стан лясной гаспадаркі пад час грамадзянскай вайны і замежнай акупацыі быў несуцяшальным. Несістэмныя і бязмерныя высечкі сталі правілам, маёмасць лясніцтваў і матэрыялы лесаўпарадкавання былі разрабаваныя, больш за 10 % лясоў было ахоплена пажарамі. Галоўнай мэтай лесакарыстання ў гэты перыяд стала нарыхтоўка дроў, доля

якіх даходзіла да 70–80 % ад усёй вывазкі драўніны. Кіраванне лясамі перайшло да Народнага Камісарыята Земляробства, дзе было арганізавана Цэнтральнае кіраўніцтва лясамі (ЦКЛ), а на месцах стварыліся лясныя аддзелы. Пры гэтым нізавым органам лесакіравання заставалася лясніцтва.

У 1925 г. быў складзены першы пяцігадовы план развіцця лясной гаспадаркі Беларусі, які даў аб'ектыўны аналіз стану лясной гаспадаркі, вызначыў памер лесакарыстання і прадугледжваў меры па развіццю галіны. Кіраўніцтва лесанарыхтоўкамі ўскладалася на ляснічых, якія цалкам адказвалі за стан і рацыянальную эксплуатацыю лясоў. Дзеля кіравання лесанарыхтоўкамі ў складзе ЦКЛ быў створаны спецыяльны аддзел "Лесзаг", які разам з галоўным лесакарыстаннем ажыццяўляў высечкі догляду і санітарныя высечкі. Вызначыўся шлях развіцця комплекснай лясной гаспадаркі на аснове прытрымкі правілаў лесакарыстання. У далейшым для ажыццяўлення лесанарыхтовак у прамысловым маштабе быў створаны трэст "Лесбел". Лясніцтвы павінны былі забяспечваць "Лесбел" лесасечным фондам, пры гэтым яны самі вялі лесанарыхтоўкі па галоўнаму лесакарыстанню [1].

Этап фарсіраванай індустрыялізацыі (1928–1941) на Беларусі характарызаваўся інтэнсіўным развіццём лесанарыхтовак, дрэваапрацоўчай і папяровай прамысловасці. У 1929 г. на Беларусі пачалі стварацца леспрамгасы, якім перадаваліся ў доўгатэрміновае карыстанне лясныя масівы, маючыя ў сваім складзе спелыя лясы, а таксама лягсасы на аснове лясоў лесакультурнага прызначэння. Загадам Урада ад 20 сакавіка 1929 г. лесанарыхтоўкі ў межах лясніцтваў былі забаронены. Высечкі догляду перавялі на бюджэтнае фінансаванне. Планаванне галоўнага лесакарыстання пачало ажыццяўляцца згодна толькі з патрэбамі народнай гаспадаркі, адкідваўся прынцып трываласці, раўнамернасці і невычарпальнасці. У 1932 г. быў створаны Народны камісарыят лясной прамысловасці, якому перадалі 70,8 % плошчы лясоў. Лясы Беларусі пачалі бязлітасна знішчацца. Лясістасць з 21 % у пачатку 30-х знізілася да 15 % у 1939 г.

Вялікія страты лясная гаспадарка Беларусі панесла ў гады Вялікай Айчыннай вайны і нямецка-фашысцкай акупацыі. За перыяд з 1941 па 1944 г. бессістэмнымі высечкамі было знішчана 75 тыс. га лясоў, загінула ў пажарах 143 тыс. га, высечана ўздоўж дарог 32 тыс. га, што склала больш за 6 % лесапакрытай плошчы. Цяжкім для лясной гаспадаркі быў і пасляваенны час. Аднаўленне народнай гаспадаркі патрабавала вялікай колькасці драўніны. З 1944 па 1949 г. ажыццяўляўся дармовы водпуск лесу на корані. Лесакарыстанне па ранейшаму праводзілася без уліку лесаводчых патрабаванняў [1,3].

Пяцідзесятыя і шасцідзесятыя гады характарызаваліся значнымі поспехамі ў развіцці лясной гаспадаркі. У 1956–1958 гг. быў складзены "Генеральны план развіцця лясной гаспадаркі Беларусі на 1956–1975 гг." Канчатковай мэтай гэтага плана быў рост лесанарыхтовак. Гадавая лесасека з 1956 па 1975 г. перарубалася ў 3,5 – 5,5 разоў. Усе лесанарыхтоўкі ў гэты перыяд, згодна з пастанаўленнем СМ БССР ад 29 красавіка 1958 г., сканцэнтраваліся ў лясной прамысловасці. На лягсасы ўскладалася толькі правядзенне высечак догляду і санітарных высечак.

Такім чынам, аналізуючы развіццё лясной гаспадаркі і лесакарыстання на Беларусі ў савецкі час, бачым яго складанасць і супярэчлівасць. Амаль што на ўсёй працягласці гэтага перыяду лясная палітыка была скіравана на развіццё магутнай лесанарыхтоўчай прамысловасці. Высечкі галоўнага карыстання вяліся па "патрэбе" з перавышэннем норм разліковай лесасекі. Асноўнай формай арганізацыі

лесакарыстання было правядзенне суцельных высечак леспрамгасамі і высечак догляду лясгасамі.

Беларусь уступіла ў новы этап свайго развіцця ў якасці незалежнай дзяржавы з ліпеня 1990 г. З гэтага часу яна набыла права самастойна вызначаць сваю палітыку, у тым ліку і ў галіне лясной гаспадаркі і прамысловасці.

Спажывецкія адносіны да лясных багаццяў, якія дамінавалі да нядаўняга часу і якія прывялі да дэфіцыту спелых лясоў, экалагічныя праблемы, а таксама ўсведамленне тэндэнцый развіцця лясной гаспадаркі ў развітых краінах прывялі да некаторых змен у поглядах на лес і яго значэнне для дзяржавы. Пачынаючы з прыняцця "Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь" (1997 г.), распрацоўкі "Стратэгічнага плана развіцця лясной гаспадаркі Беларусі" (1997 г.), а таксама прыняцця "Лясного кодэксу Рэспублікі Беларусь" (2000 г.) галоўную мэту лясной гаспадаркі вызначае навукова абгрунтаванае, комплекснае выкарыстанне лясоў, іх ахова, абарона і ўзнаўленне на аснове наступных прынцыпаў:

– трываласці, невычарпальнасці і адноснай раўнамернасці лесакарыстання;
– захавання біялагічнай, генетычнай, відавой і ландшафтнай разнастайнасці лясоў, павышэння іх экалагічнага і рэсурснага патэнцыялу;
– узмацнення эканамічнай і сацыяльнай значнасці лясной гаспадаркі [4].

Згодна з гэтымі дакументамі, дзеля павышэння эфектыўнасці працы лесанарыхтоўчых прадпрыемстваў неабходна развіццё і заканадаўчае замацаванне рынкавых асноў гаспадарання, развіццё інавацыйнай палітыкі, накіраванай на ўкараненне новай тэхнікі і тэхналогіі, развіццё і падтрымка прадпрымальніцтва, ажыццяўленне рэструктурызацыі прадпрыемстваў лясной гаспадаркі ў адносінах да рынкавай эканомікі. Аднак застаецца нявырашаным пытанне аб тым, як нам далей развіваць лесанарыхтоўчыя прадпрыемствы – як асобную галіну прамысловасці ці ў межах лясной гаспадаркі.

У заключэнне хацелася б дадаць, што шмат у якіх развітых краінах са стабільнай эканомікай, такіх, як Швецыя, Фінляндыя, Германія і інш. менавіта экалагічныя карыснасці лесу выходзяць на першыя ролі ў ацэнцы комплексу лясных рэсурсаў і каштоўнасцей лесу ў сістэме шматмэтавага лесакарыстання. Гэты працэс не абмінуў і Беларусь, і зараз можна адзначыць, што адбываецца паступовы пераход да наступага перыяду лесакарыстання – **перыяду шматмэтавага ўстойлівага вядзення лясной гаспадаркі.** Лес пачынае разглядацца не толькі як крыніца драўніны, але і як крыніца недраўнінных, экалагічных, рэкрэацыйных і іншых карыснасцяў. Гэты працэс трансфармацыі патрабуе пэўнага ўзроўню развіцця гаспадаркі і эканамічных адносінаў. У яго аснове павінен ляжаць прынцып "здаровая эканоміка – здаровая экалогія", дзеля чаго неабходна глыбокая рэструктурызацыя галіны з улікам патрабаванняў рынкавай эканомікі і канцэпцыі ўстойлівага развіцця лясной гаспадаркі. Далейшае развіццё рацыянальнага лесакарыстання і адначасова ўзмацненне ролі лесу як стабілізатара экалагічнага становішча павінна стаць адной з важнейшых умоў росквіту лясной гаспадаркі Беларусі.

## ЛІТАРАТУРА

1. Янушко А.Д. Лесное хозяйство Беларуси (история, экономика, проблемы и перспективы развития).– Мн.: БГТУ, 2001. – 248 с.

2. Переход В.И. Теория лесного хозяйства. Курс лесной экономики со статистикой. Изд. II. – Мн.: Белтрестпечать, 1924. – 232 с.

3. Багинский В.Ф., Есимчик Л.Д. Лесопользование в Беларуси: история, современное состояние, проблемы и перспективы. – Мн.: Беларуская навука, 1996. – 367 с.

4. Стратегический план развития лесного хозяйства Беларуси. – Мн.: Министерство лесного хозяйства РБ, 1997. – 180 с.

УДК 630.79

Е.В. Мещерякова, ст. преподаватель; О.В. Стрельцова, студентка;
А.Р. Лотыш, студент

## НАПРАВЛЕНИЯ РЕФОРМИРОВАНИЯ ЦЕЛЛЮЛОЗНО-БУМАЖНОЙ ПРОМЫШЛЕННОСТИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

The Republic of Belarus has considerable stock of timber, part of which after conversion is formed into timber of little value and wastage. The pulp and paper industry has the first place in effective using this type of raw material. In Belarus it is necessary to milt to built some factories for making wood–pulp, to organise a power conversion of wastage's, to determine perspectives of using forest plantations for development this branch.

Продукция целлюлозно-бумажной промышленности (ЦБП) является материальной основой развития культуры, образования, без специальных ее видов невозможно нормальное функционирование ряда отраслей. Недаром уровень развития общества оценивается по масштабам потребления бумаги и картона на душу населения.

В Беларуси на душу населения приходится 106 м$^3$ древесины на корню. В перспективе объем заготовок ликвидной древесины будет расти. К 2015 г. по сравнению с 1999г. он увеличится на 74% и составит более 19 млн. м$^3$. Также возрастет и объем вторичного древесного сырья, который в совокупности с малоценной и топливной древесиной составит к 2015 г. около 18 млн. м$^3$. Это ценное древесное сырье, используемое на современном этапе не в полной мере. Требуется определить наиболее перспективные направления его переработки.

Важнейшим показателем, характеризующим степень использования лесосырьевых ресурсов, является удельный вес продукции химической и химико-механической переработки древесины в совокупной продукции лесопромышленного комплекса, так как в этом случае можно достичь более полного и комплексного использования древесного сырья и производить продукцию с высокой потребительной стоимостью. Например, в Канаде, США, Швеции и Австрии доля продукции химической и химико-механической переработки древесины составляет 70–85%, в Финляндии – 88%, а в Беларуси – лишь 48% от общей стоимости произведенной лесопродукции.

Первое место по эффективности использования малоценного и вторичного древесного сырья занимает целлюлозно-бумажная промышленность (ЦБП), и наиболее полное вовлечение в переработку древесины различного породно-качественного состава обеспечивает производство древесной массы. В Финляндии, например, 24 завода по производству целлюлозы и полуцеллюлозы и 23 – по выпуску древесной массы. В Норвегии из 19 заводов по производству волокнистых полуфабрикатов 12 производят древесную массу, в Швейцарии из 4 – 3, в Германии из 19 – 14.

Древесная масса служит сырьем для получения различных сортов бумаги и картона, ее производство имеет следующие преимущества перед производством целлюлозы: более высокий выход основного продукта – 85–96%; гибкость технологического процесса, позволяющая получать полуфабрикаты с различными свойствами на одном и том же оборудовании и из различного породно-качественного состава древесного сы-